


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 24 (148) 23 кастрычніка 1990 года


## ВІНШАВАННІ Ў АДРАС ЮБІЛЯРАЎ

Пісьмо-віншаванне рэдакцыя атрымала ў адрас **ВАСІЛЯ МІХАЙЛАВІЧА НІКІЦЕВІЧА**, прафесара, загадчыка кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства. Калегі з філфака пішуць:

«Сардэчна віншуем з 65-гадовым юбілеем. Дасылаем самыя шчырыя віншаванні.

Большую частку свайго жыцця Вы аддалі служэнню навуцы, Ваша імя як вучонага добра вядома, і аўтарытэт — заслужаны. Распрацаваная вамі тэорыя намінатыўнай дэрывацыі — значны ўклад у развіццё агульнай тэорыі мовазнаўства. З энергіяй і энтузіязмам Вы праводзіце свае навуковыя даследаванні, вялікая працаздольнасць, высокі прафесіяналізм, творчыя адносіны да справы дапамагаюць паспяхова кіраваць калектывам кафедры.

Паважаем Вас за працаздольнасць, сумленнасць, патрабавальнасць перш за ўсё да сябе, уважлівыя адносіны да людзей. Нездарма паважаюць Вас, Васіль Міхайлавіч, студэнты. Лекцыі адрозніваюцца высокім узроўнем і навуковай глыбінёй зместу, у іх заўжды прысутнічаюць цікавая форма і глыбіня выкладання.

Няхай жа Вашы глыбокія веды і багаты вопыт паслужаць многім вучням і паслядоўнікам.

Жадаем шчасця, здароўя, дабрабыту, далейшых творчых поспехаў, новых ідэй і адкрыццяў у навуцы!»

✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦

З 75-гадовым юбілеем калектыў філфака віншуе таксама Рыгора Уладзіміравіча Ярмоленку. У яго адрас таксама — добрыя словы:

«Філфак стаў для Вас сапраўдным родным домам, станаўленню якога Вы аддалі шмат сіл і энергіі. Разнабаковыя навуковыя інтарэсы дапамагалі Вам паспяхова рыхтаваць і чытаць самыя розныя курсы лекцый: па балгарскай мове, агульнаму мовазнаўству, сучасных метадах вывучэння мовы, тэксталагічнаму аналізу, колькасных метадах пры вырашэнні праблемы аўтарства тэкстаў і многія іншыя, за якія так удзячны Вам вашы вучні. Рабілі Вы гэта, як і ўсё, за што б ні браліся, з добрасумленнасцю, высокім прафесіяналізмам...

Жадаем захаваць аптымізм, жыццялюбства, дабрыню і шчырасць, упартасць у навуковых даследаваннях. Здароўя, радасці і шчасця Вам і Вашай сям'і!»

# УСЕСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ПРАБЛЕМЫ ПСІХАЛАГІЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў РАБОЦЕ З ЛЮДЗЬМІ»

### ПРАХОДЗІЛА Ў ПАЧАТКУ ГЭТАГА МЕСЯЦА ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ




У Гродна прыехалі псіхолагі з Масквы, Кіева, Львова, Горкага, Мінска, Свярдлоўска, Драгобыча, Калінінграда, Казані, Шаўчэнка, Запарожжа і іншых гарадоў. У рабоце канферэнцыі прыняло ўдзел 24 доктары навук.

Абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з рознымі аспектамі псіхалогіі творчасці ў рабоце з людзьмі. Прайшло 2 пленарных і 5 секцыйных пасяджэнняў, а таксама круглы стол на тэму **«Рэфлексіўныя працэсы ў рабоце з людзьмі».**

Канферэнцыі быў прысвечаны спецыяльны выпуск нашай газеты. Сёння мы друкуем водгукі некаторых удзельнікаў, узятыя намі пасля завяршэння яе работы і дасланыя ў адрас кафедры псіхалогіі. Цікава будзе чытачам пазнаёміцца і з вывадамі арганізатара канферэнцыі, загадчыкам кафедры псіхалогіі Святланы Вітальеўны Кандрацьевай.


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

- РАЗМОВА АБ НЯДАЎНЯЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ПСІХОЛАГАЎ
- ВІНШАВАННІ ЮБІЛЯРАМ
- ЯШЧЭ РАЗ ПРА НАШУ ПАЗІЦЫЮ
- СТУДЭНЦКАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ
- НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ»




## *Удалася на славу*

**З радасцю і ўдзячнасцю ўспамінаю нашу канферэнцыю і цудоўныя дні, праведзеныя ў Гродна!**

**Пасля абмену думкамі ў поездзе з удзельнікамі канферэнцыі высветлілася, што яна ўдалася на славу. Усе задаволены і ўдзячны за радушны прыём і выдатную арганізацыю канферэнцыі.**

**І. СЯМЁНАЎ,**
**старшы навуковы супрацоўнік НДІ агульнай і педагагічнай псіхалогіі АПН СССР.**

*НА ТЭМУ ДНЯ*

# А нам усё роўна...

Бадай што часцей за ўсё сёння на вуснах усіх савецкіх людзей гучаць словы: рынак, рыначная адносіны. Пераход з будучага года на рыначную эканоміку хвалюе ўсіх. Таму і вырашылі правесці ва універсітэце «круглы стол», прысвечаны праблемам пераходу да рынку, умовам, у якіх будзе знаходзіцца адзін з найбольш неабароненых слаёў насельніцтва — моладзь. Павінны былі за «круглым сталом» у адкрытай, даверлівай размове абмеркаваць, што ж чакае нашых студэнтаў праз два месяцы, якія прадпрыняць крокі, каб пераход да рынку найменш балюча адбіўся на вучэбным працэсе, матэрыяльным становішчы студэнтаў, іх сацыяльным жыцці.

Можа і хвалююць гэтыя пытанні некага, але не студэнтаў нашага універсітэта. Ці арганізацыя «круглага стала» была праведзена не на патрэбным узроўні? Так або інакш,— ці то гэта наша ў крайняй ступені духоўнае апусташэнне, абыякавасць да ўсяго, або непаваротлівасць арганізатараў,— але «круглы стол» не адбыўся. Прыйшло ажно 11 студэнтаў. Яўка нікуды не годная. Чаго не скажаш пра дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедр, выкладчыкаў, якія прыйшлі, каб дапамагчы студэнтам разабрацца ў злабадзённых пытаннях іх жыцця.

Вырашана яшчэ раз паспрабаваць сабраць студэнтаў, у якіх ёсць нейкія прапановы, хто ўсё-такі не абыякавы да свайго будучага, і правесці «круглы стол» крыху пазней. Пакуль жа рэктар прапанаваў выкладчыкам правесці гутаркі на факультэтах, у групах, каб высветліць кола пытанняў, якія хвалююць студэнтаў, зацікавіць іх і выклікаць на размову на агульнауніверсітэцкім узроўні.

Пытанняў жа, якія неабходна абмеркаваць і прыняць пэўныя рашэнні, вельмі шмат. А менавіта на іх і спыніўся рэктар А. В. Бадакоў... Гэта пытанні дэмакратызацыі вышэйшай школы, удзел студэнтаў у гэтым працэсе. Неабходна ажывіць прамую студэнцкую дэмакратыю (студэнты самі абмяркоўваюць праекты рашэнняў, прымаюць пастановы і адрасоўваюць іх у любыя інстанцыі), выкарыстоўваючы прадстаўніцтва студэнтаў у вучоным Савеце, у камісіях і грамадскіх арганізацыях.

Важным на сёння з'яўляецца і тое, як падняць ролю студэнтаў ва ўдасканаленні вучэбнага працэсу. Рэктар прапанаваў ужо на першым курсе знаёміць студэнтаў з планамі па ўсяму аб'ёму і зместу падрыхтоўкі ва універсітэце, ісці па шляху павышэння самастойнасці, свабоды выбару студэнтам дысцыплін і, з другога боку, павышэння адказнасці. Можна падаўжаць і скарачаць вучэбны працэс, індывідуалізаваць яго. Неабходна падумаць і аб увядзенні інтэнсіўных форм вывучэння прадметаў, безсесійнай сістэме, падаўжэнні навучання ў іншых ВНУ нашай краіны і за мяжой. Трэба ажывіць студэнцкую навуковую творчасць, стварыць розныя курсы, цэнтр рэабілітацыі, групы здароўя. Наспеў час замацаваць за студэнтамі права на авалоданне другой, трэцяй спецыяльнасцю, вывучэнне цыклу прадметаў, наведванне любых курсаў. Ёсць думка запрашаць на сустрэчы са студэнтамі вядомых вучоных не толькі нашай краіны, але і свету.

Што датычыцца пераходу на рыначную эканоміку, то ўжо ў наступным годзе прыём студэнтаў на першы курс павінен быць забяспечаны кантрактамі. Такім чынам, не ўсе паступіўшыя будуць залічаны. Адмяняецца размеркаванне на работу ў тым выглядзе, у якім яно існуе сёння. У гэтым плане неабходна стварэнне ва універсітэце службы абароны студэнтаў. Яна павіна займацца пошукам рабочых месц, улікам існуючых вакансій, абаронай сацыяльных правоў выпускнікоў. Трэба стварыць і фінансавы фонд абароны студэнтаў, абгаварыць яго крыніцы.

Ёсць у рэктара і іншыя задумкі, якія неабходна абмеркаваць разам. Гэта і двухступеньчатая вышэйшая адукацыя, і плата за пераздачу з трох разоў, і частковая плата за дадатковыя віды навучання, і стварэнне кансультацыйнага пункта (генетычныя кансультацыі ў галіне псіхалагічнай сумяшчальнасці па праблемах стварэння і ўмацавання сям'і і іншыя). Усё гэта нельга вырашыць без шырокага абмеркавання сярод студэнтаў. Таму спадзяёмся, што ў наступны раз актавая зала не застанецца пустой. Да таго ж, ёсць думка аб рэгулярным правядзенні універсітэцкіх рэферэндумаў па ўсіх буйных пытаннях.

**І. АНІКЕВІЧ.**

# УСЕСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

## «ПРАБЛЕМЫ ПСІХАЛАГІЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ...»

(ПАЧАТАК РАЗМОВЫ НА 1-й СТАРОНЦЫ)

## *Сабраліся людзі творчыя*

*ІНТЭРВ 'Ю З КАНДРАЦЬЕВАЙ, ЗАГАДЧЫЦАЙ КАФЕДРЫ ПСІХАЛОГІІ*

**— Святлана Вітальеўна, ці задаволены Вы канферэнцыяй!**

— Мяне задавальняе змест праведзенай канферэнцыі. Ён знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці з сучасным узроўнем навукі псіхалогіі. На канферэнцыю ўпершыню сабраліся спецыялісты, якія займаюцца не проста творчасцю, а творчасцю ў рабоце з людзьмі. Мяркуючы па водгуках, вусных і пісьмовых, канферэнцыя прынесла вялікую карысць удзельнікам і ў сэнсе атрымання арыгінальнай інфармацыі, і ў сэнсе знаходжання кантакта, і ў сэнсе пошуку шляхоў творчага супрацоўніцтва ў галіне навуковай работы, публікацый, і, галоўнае, у галіне абмену метадамі даследаванняў. Шэраг вучоных прапанавалі арганізоўваць такія канферэнцыі раз у тры гады на базе Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.

**— Якія найбольш значныя здабыткі прайшоўшай канферэнцыі Вы хацелі б вылучыць!**

— Важным дасягненнем з 'яўляецца тое, што на ёй было прадстаўлена даследаванне творчасці ў розных відах прафесійнай дзейнасці, аб 'ектам якой з 'яўляецца чалавек: педагагічнай, юрыспрудэнцыі, медыцыне, экалогіі чалавека, вытворчай дзейнасці. На жаль, апошняя была прадстаўлена слабей у сувязі з адбываючыміся ў краіне працэсамі. І вучоныя спыніліся ў пошуку псіхалагічнага забеспячэння новых праблем, якія паўсталі перад прадпрыемствамі ў час перабудовы.

Па водгуках удзельнікаў канферэнцыі, вельмі цікавымі былі секцыі, асабліва дыскусія аб шляхах развіцця творчых здольнасцей моладзі, а таксама круглы стол «Рэфлексіўныя працэсы ў рабоце з людзьмі».

**— А што атрымалася не так, як хацелася, як было задумана!**

— Былі і недахопы ў арганізацыі. Некаторыя ўдзельнікі хацелі, каб была праведзена сустрэча з членамі кафедры псіхалогіі. Адбылася сустрэча ў рэктара, а вось на кафедры так і не сабраліся. З-за арганізацыйных работ і жадання аказаць асаблівую ўвагу гасцям мы не здолелі ў дастатковай меры паказаць работу кафедры, не ўсе члены кафедры змаглі выступіць з дакладамі. У далейшым на такіх канферэнцыях трэба больш увагі надаваць інфармацыі аб рабоце кафедры.

**Інтэрв 'ю са С. В. КАНДРАЦЬЕВАЙ правяла І. АНІКЕВІЧ.**

## КАНФЕРЭНЦЫЯ І ЯЕ ЎДЗЕЛЬНІКІ

На канферэнцыі не было людзей абыякавых. Хіба ж гэтыя здымкі — не яскравае таму пацвярджэнне?

* * *







**ВОДГУКІ**

## *Свабода ўласных меркаванняў*

Як вядома, наша краіна цяпер перажывае такі час, калі робяцца спробы вывесці яе на якасна новы ўзровень развіцця. Гэта выражаецца у тым, што адбываюцца глыбокія змены ў палітыцы, эканоміцы, ідэалогіі, культуры, у арганізацыі навукі, адукацыі і нават арганізацыі таго, што больш за ўсё адносіцца да нашага будзённага існавання — сферы абслугоўвання. Безумоўна, вельмі вялікія змены ва ўсіх гэтых галінах не адбудуцца, калі кіраўнікі нашага грамадства і ўсе савецкія людзі будуць дзейнічаць па-старому, калі не праявяць сваіх здольнасцей, мэтанакіраванага імкнення да сапраўднай творчасці і ў вялікім, і ў малым.

На канферэнцыі «Праблемы псіхалогіі творчасці ў рабоце з людзьмі» асвятляліся і тэарэтычныя, і эксперыментальныя, і часта прыкладныя аспекты творчасці. А важныя яны перш за ўсё тым, што ўзбройваюць веданнем заканамернасцей, механізмаў, па якіх павінна будавацца дзейнасць і палітыка эканаміста, прадстаўніка сферы навукі, выхавання, культуры, каб вынікі былі пасапраўднаму творчымі і служылі народу, чалавеку.

Гэта першы і галоўны вынік канферэнцыі. Другі — больш прыватны. У нашым грамадстве дзейнічаюць дзве выхаваўчыя сістэмы. Да першай вялікай выхаваўчай сістэмы можна аднесці навуку, культуру, эканоміку, палітыку. Да малой — сям 'ю, дашкольныя дзіцячыя установы, школы, ПТВ, тэхнікумы, ВНУ, рабочыя калектывы. І ад таго, як суадносяцца вялікія і малыя выхаваўчыя сістэмы, залежыць, якая асоба і з якімі якасцямі будзе фарміравацца. На канферэнцыі разглядалася, як трэба па-новаму будаваць творчае навучанне для таго, каб паспяхова ажыццявіць мэты выхавання, бо цяпер яны змяніліся. Раней былі накіраваны на выпуск сярэдняга тыпу асобы. Зараз узяты іншы кірунак: раскрываць непаўторнасць кожнага чалавека, яго здольнасці, ствараць умовы, каб здольнасці развіваліся. А гэта азначае, што зноў неабходна ўнясенне элементаў творчасці ў звяно выхавання сям 'і, у звяно дзіцячага саду, тэхнікума, школы, ВНУ, дзе шмат яшчэ руціны, шаблонаў, стэрэатыпаў. На канферэнцыі якраз і ішла гутарка пра тое, як вырвацца з гэтых путаў, каб найбольш поўна раскрыць патэнцыял кожнай асобы.

Я бываю на многіх канферэнцыях. Сёння з цяжкасцю прабіваецца сапраўдны плюралізм. Але ход канферэнцыі, сам дух яе аказаліся вышэй, чым на ўсіх папярэдніх. Людзі выказваліся без усялякіх аглядак, яны адыйшлі ад кананізіраваных догмаў і адважыліся на свабоду ўласных думак, меркаванняў. Таму атрымаліся цікавыя выступленні, дыялогі, спрэчкі, у якіх і нараджалася ісціна.

**А. БАДАЛЕЎ,**

**сапраўдны член Акадэміі педагагічных навук, доктар навук, прафесар, загадчык лабараторыі НДІ псіхалогіі АПН СССР.**

**ВОДГУКІ**

## *ЦУДОЎНЫ НАВУКОВЫ ФОРУМ*

**Яшчэ раз хачу падзякаваць за той цудоўны навуковы форум, які для нас арганізавалі. Думаю, што яшчэ доўга яго ўдзельнікі будуць успамінаць Гродна, мясцовы універсітэт і мілую, абаяльную гаспадыню канферэнцыі. Дзякуй.**

**Ю. КАРНІЛАЎ,**

**загадчык кафедры псіхалогіі Яраслаўскага дзяржаўнага універсітэта.**


### ПАДПІСКА-91

**Штотыднёвік «ГАЛОСНАСЦЬ»**

Са старонак гэтага выдання вы атрымаеце аператыўную інфармацыю:

— пра дзейнасць ЦК КПСС, яго Палітбюро і Сакратарыята, Прэзідэнцкага Савета, Савета Федэрацыі, Урада і урадавых установаў, Саветаў усіх узроўняў;

— пра тое, як ідзе працэс абнаўлення КПСС, пра камуністаў, якія задаюць тон у гэтай рабоце;

— пра новыя партыі, грамадскі рух, групіроўкі іх лідэраў;

— пра актуальныя праблемы нацыянальных і міжнацыянальных адносін;

— пра ўсё цікавае, што адбываецца ў палітыцы, эканоміцы, грамадскім і духоўным жыцці краіны і за мяжой.

НОВЫ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

— будзе публікаваць каментарыі вядомых у краіне і за мяжой аўтарытэтаў пра падзеі, вынікі сацыялагічных даследаванняў, актуальную статыстыку;

— дасць справядлівую ацэнку негатыўным працэсам у розных структурах грамадства, у тым ліку і ў законах, якія стаяць сёння па-за крытыкай;

— адкажа на самыя цяжкія пытанні сваіх чытачоў.

Кожны падпішчык зможа з дапамогай штотыднёвіка выразіць асабістае разуменне галоснасці: прыняць удзел у рабоце рэдакцыі, прапаноўваючы свае тэмы, пытанні, праблемы і разам з карэспандэнтамі даводзіць іх ад задумы да газетнай паласы.

Рэдакцыя запрашае падпішчыкаў стаць сааўтарамі «Кнігі лёсаў», у якой будуць сабраны дакументальныя пасведчанні тых, хто быў непасрэдным удзельнікам падзей нашай гісторыі, можа расказаць аб гераізме савецкіх людзей, іх подзвігах, здзейсненых у імя Радзімы, свайго народа.

У кожным нумары будуць публікавацца гістарычныя матэрыялы. Сярод іх:

— старонкі асабістых архіваў Сталіна, Троцкага, Бухарына, Андропава, Яжова і іншых дзеячаў мінулага;

— дакументы, якія знаходзяцца цяпер пры разборцы старых архіваў;

— дзённік асабістага сакратара трох Генсекаў;

— урыўкі з найбольш цікавых публікацый часопіса «Известия ЦК КПСС» («ЦК у студзені 1924 года», «Як выключылі з партыі Троцкага», «Бухарын перад партыйным судом», «Справа Берыя», «Аб антыпартыйнай групе Маленкова, Кагановіча, Молатава», «Апала маршала Жукава», «Адстаўка Хрушчова» і іншыя).

ПРАЎДЗІВАЯ, АБ 'ЕКТЫЎНАЯ, РОЗНАБАКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ — ГАЛОЎНЫ ПРЫНЦЫП НОВАГА ВЫДАННЯ

Падпіска на яго прымаецца ўсюды

Індэкс 500018

Падпісная цана на год 7руб. 80 кап.; на паўгода 3 руб. 90 кап.; на 3 месяцы 1 руб. 95 кап.

# «НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ»

## *Юры Карэйва*

### ЗОРНАЯ МРОЯ

Ты зорка, табе няможна на зямлю...
С. Кавалёў.

Высню воч тваіх сінечу,
Высню вуснаў мілы ўсмех —
І бясконцым Шляхам Вечным
Сыдзеш да мяне ў тым сне.

Ты насустрач мне на росы
Толькі ступіш — і з вышынь
Пацякуць, як шчасце, слёзы,
Залатыя капяжы!..

І пакуль нам добра гэтак —
Не адвесці воч ад воч!, —
Срэбным човенам нас ветах
Адвязе напрочкі ў ноч.

Адплывем з табой далёка
У нязведанае, дзе, —
Толькі мы, дзе гэтак лёгка
Сэрцу вырвацца з грудзей!..

А на ранні ў час расстання
Зорны шлях, што нас злучыў,
Зноў растане — зноў мы станем
Мройным рэхам, сном, нічым...

## *Юрась Пацюпа*

### ЛЕСАПАВАЛ

У белую драўніну ўвап ´ецца
сугучная і тонкая піла...
Маруднае забойства. Але з месца
бяроза, як стаяла — не ўцякла.

А мы, бы тыя цмокі, у палацах
з хваёвых ды бярозавых касцей,
бо ўжо няма куды з кастра падацца —
век сеяць хлеб і гадаваць дзяцей.

### НОВЫЯ ГІПЕРБАРЭЙЦЫ

... І ледзяную скуру лёд
лядовым полымем запаліць...
У вечнасці а бляску вод
мы ў нотак летапіс складалі,
мы зразумелі смерць сваю,
у новы кон ішлі маўклівыя,
рай і забраную зямлю,
залом-пытанне вам пакінулі.

## *Едрусь Мазько*

Мы памыліліся ў каханні,
І яно ўкрыжавала нас.
Ты Сьнятовая Каралева...
Я Сонечны Кароль...
Між намі — касьцёр з мокрых дроў.
Ён зацёплы для цябе
Ён захалодны для мяне.
Ты моліш вецер астудзіць яго,
Я прашу неба высушыць дровы.
Ды нікому ніякай справы
да двух пясочын,
згубіўшыхся ў віхор Сусьвету...

## *Андрэй Пяткевіч*

А сёння мне ўсміхнуўся Дыяген —
Славуты Кінік з доўгай барадою.
І я падняўся з схіленых кален,
Пайшоў, так як і ён, па волю.

Узяў ліхтар з яго старэчых рук
І запаліў, хоць сонейка свяціла.
А нада мной праклён гарланіў крук,
Але я ведаў — ёсць другая сіла.

Сярод бяды і зорных прамянёў —
Атрутных прамянёў — я смела крочыў.
На сцежцы — чалавечых чарапоў
Ляжала горба і глядзела ў вочы.

А потым я памёр між чорных сцен,
За кратамі, увесь у крыві і ў болю,
А мне з Нябёсаў усміхнуўся Дыяген,
Славуты Кінік з доўгай барадою.

✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦

Норму дзён і начэй нам адмерыць
крывавае вока.
Спелай вішняй ўпадзе на талерку
адцяты язык
Адчыні свае дзверы, і ўбачыш як унізе
глыбока
Белай смерцю палае завеі праступджаны
крык.

Адрываюць канцэпты душу
ў рэчаіснасці шэрай.
На аблоках танцуе пакрыўджаны бог
з барадой.
Графаманы трасуць, нібы сцягам,
аблезлай паперай
І бягуць ліхтары за табою дурной
чарадой.

Супыніся, адчуй, як палае маўклівае
цела;
Як крычаць, бы ад крыўды, на тварах
пустыя насы.
Статак белых варон пралятае над дахам
нясмела.
Гэта мы, і нас гоняць далёка ў густыя
лясы.

А ўнізе, дзе жабы, дзе людзі, і птушкі,
і коні,
Зарастаюць засеяным полем цяжкія
даўгі.
Мірыяды галактык нясуцца за намі
ў пагоню.
Смехам поўняцца чорныя ў вёсцы
далёкай снягі.

## *Юры Гуменюк*

### БЛУКАЮЧЫ НЯБОЖЧЫК

Бачу цень незнаёмага мне чалавека.
Толькі цень. Больш нічога. І поўня
ў імгле.
Гэта нехта агідны, здаецца, калека,
Але ж зубы блішчаць, як праменні
на шкле.

Ён мне хоча сказаць, што страшэнна
галодны,
Што блукае па вуліцах некалькі год,
Што пакінуў свой дом адпачынку
і родных,
Каб не дыхаць атрутай, пазбыцца
клапот.

Ён самотны і белы. Вядома, нябожчык,
Які выйшаў на шпацар з халоднай
труны.
Не патрэбны яму ні каханкі, ні грошы
Толькі нехта прыгожы, як голкі сасны.

Бедны кажа, што прагне маленькі
кавалак
Чалавечага сэрца, якое жыве
Сярод бруду мяйсцовага, смеха і
сварак,
Сярод крэмняў у жоўтай ад поўні
траве.
верасень 1990.

✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦✦

### ТАЯМНІЧАЯ ШАФА

Таямнічая шафа заўсёды хавае шпіёнаў
І муштруе мышэй, калі зоркі рагочуць
у небе.
Таямнічая шафа не ведае іншых
законаў,
Бо заўсёды яна ў сэксуальнай патрэбе.

Таямнічая шафа, як мора для рыб
з дзіўных казак,
Дзе шукаюць заўзята патрэбную
страву.
Таямнічая шафа зусім не баіцца заразы,
Бо жыве толькі ноччу і ведае справу.

Ну а справа такая, што нельга сварыцца,
Нельга плакаць, як плача старая
жырафа,
Бо цвярозы сусед можа так памыліцца,
Што загіне твая таямнічая шафа.
ліпень-жнівень 1990.

## Якія мы?

Калі шчыра, то я ганаруся літаб ´яднаннем «Наднёманскія галасы». За апошнія два гады яно ператварылася з аморфнага з ´явішча ў даволі значную літаратурную сілу. Паэты нашага літаб ´яднання выступалі на ТБ, друкаваліся ў газетах і часопісах. Вясной 1991 года павінен выйсці ў свет паэтычны зборнік Юрася Пацюпы. Асноўная сіла аб ´яднання — Юрась Пацюпа, Юры Гуменюк, Едрусь Мазько, Юры Карэйва, Таццяна Абухоўская, Ігар Заўялаў, Ігар Хох,— стварае творчы клімат у літаб ´яднанні, актыўна шукае новыя формы творчасці, вострыя тэмы, змагаецца супраць сілаў зла і сатаны. Адным словам, наша згуртаванне перажывае свой росквіт. І немалая заслуга ў гэтым М. У. Мікуліча, нашага кіраўніка. Ён аб'яднаў маладых творцаў, арганізаваў выступленні на ТБ і перад моладдзю, падрыхтаваў публікацыі ў газетах.

Аднак, нягледзячы на росквіт і пэўныя перамогі, я стаўлю перад сабой пытанне: якія мы? Ці ўсё, што ў нашых сілах, робім, каб дапамагчы роднай Беларусі падняцца на ногі, стаць па-сапраўднаму незалежнай дзяржавай? Мяне хвалюе пазіцыя тых нашых творцаў, якія сцвярджаюць, што палітыка і паэзія несумяшчальныя, кіруюцца гэтай тэзай у сваёй творчасці. Што ж, я паважаю і такую паэзію, але не згодзен з ёй. Менавіта цераз палітыку ідуць змены ў нашым грамадстве, і паэт можа ўплываць на становішча ў краіне сваімі творамі, сваёй публіцыстыкай, актыўнай пазіцыяй. А чыстае мастацтва цяпер, у наш час,— гэта страўс, які схаваў галаву ў пясок. Яшчэ старажытнагрэцкі філёзаф казаў: «Хіба я магу захапляцца прыгажосцю зорнага неба, калі на зямлі столькі зла несправядлівасці». Хаця свой палітычны твар мы паказалі ў Доме палітасветы, выступаючы перад першымі сакратарамі райкомаў і гаркомаў камсамола. Але гэтага мала. Трэба больш актыўна змагацца! Хіба баімся? Літаб ´яднанне амаль не выступала на мітынгах, якіх было шмат у гэтым годзе ў Гародні. Можна было б і літаратурны мітынг правесці, сваімі сіламі.

На маю думку, перад літаб ´яднаннем стаяць наступныя задачы: 1) трэба актыўна і дружна выступіць з патрабаваннем вярнуць роднай мове граматыку Б. Тарашкевіча; 2) неабходна наладзіць цесную сувязь з вольнымі газетамі «Навіны БНФ» , «Свабода», «Грунвальд», «Атмода» і даваць туды тыя вершы і артыкулы, якія па палітычных меркаваннях ці па рэдактарскай палахлівасці немагчыма друкаваць (пакуль што!) у савецкіх выданнях.

Цяпер мы рыхтуем два свае калектыўныя зборнікі. Спадзяёмся ўбачыць іх у наступным годзе.

Не радуе мяне і наша папаўненне. Маладыя паэты, якія нядаўна прыйшлі ў літаб ´яднанне, займаюць пасіўныя пазіцыі. Юрась Пацюпа, які адзін займаўся, акрамя ўсяго іншага, літаратурнай крытыкай, пераехаў у Мінск. А. Раманчук падаваў надзеі як крытык, але ў апошні час яго чамусьці не чутно і не відно. Толік, дзе ты? Мала ў нас празаікаў. Няўжо прозу больш складана пісаць, чым вершы?

Насоўваецца рынак. А ў літаб ´яднання няма матэрыяльнага фонду. Гэта агульны клопат. Стварыўшы фонд, мы адчуем сябе больш незалежнымі, зможам выязджаць з выступленнямі за межы горада і раёна, несьці прагрэсіўныя ды свабодныя ідэі простаму народу.

Якія мы? Розныя! Кожны паэт па-свойму адлюстроўвае перш за ўсё сваю думку, а ўжо потым — складаны навакольны свет. І кожны паэт павінен пасвойму змагацца за тое, каб ягоная душа была вольная, без якога бы то ні было прыгнёту.

**АНДРЭЙ ПЯТКЕВІЧ.**



Гродна, Пакроўскі сабор.

## МАСТАЦКІ ТЭЛЕГРАФ

**У наступным годзе ў бібліятэчцы часопіса «Маладосць» выходзіць паэтычная кніга Юрася Пацюпы —«Ноч».**

**Дарэчы, 13 кастрычніка ў Мінску адбыўся шлюб Юрася з мінскай паэткай Анжэлінай Дабравольскай.**

**Вядомы гарадзенскі Дыяген, аўтар славутых «баявікоў»: «Чырвоная ноч», «Новы Год», «Над нашай краінаю...», «Тбілісі», «А на вуліцы няма вясёлых твараў...» Андрэй Пяткевіч зноў пакінуў Гародню, каб жыць самотна ў вёсцы ды пісаць вершы. Колькі ён там вытрымае — невядома. Але вядома тое, што гэтым летам Андрэй напісаў больш за 60 вершаў! Зусім нядаўна з-пад яго пяра выйшлі вершы, прысвечаныя самаспаленню Уладзіміра Грыгор ´ева на плошчы Леніна.**

**У снежні ў Доме творчасці «Іслач» пад Мінскам будзе праходзіць семінар маладых літаратараў. У складзе дэлегацыі нашага горада Алесь Чобат, Юры Гуменюк, Андрэй Пяткевіч, Едрусь Мазько, Вячаслаў Клебан, Аляксандр Захарэвіч.**

### АНОНС!

**У наступнай літаратурнай старонцы з ´явіцца нізка вершаў Юрыя Гуменюка пад назовам «Малітвы Даймана». Гэтыя творы пакуль што нідзе не друкаваліся (акрамя «Сам сабе»), а некаторыя з іх чыталіся паэтам публічна толькі ў Кракаве ў ліпені гэтага года.**

## СТАРОНКІ З ГІСТОРЫІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

# АСТРЫНА

**Даследаванні, заснаваныя на мясцовым матэрыяле, садзейнічаюць узбагачэнню гістарычных ведаў больш поўнымі і канкрэтнымі данымі. Беларускія вучоныя ўнеслі вялікі ўклад у вывучэнне гісторыі гарадоў Беларусі: Мінска, Гродна, Магілёва, Полацка, Слуцка і іншых. Меншая ўвага надавалася вывучэнню невялікіх гарадоў, мястэчкаў, вёсак. Нашу ўвагу прыцягнуў пасёлак Астрына.**

Астрына — гарадскі пасёлак, які знаходзіцца за сорак кіламетраў ад Гродна ў напрамку на Вільнюс. У цяперашні час ёсць шмат пунктаў гледжання на паходжанне назвы гэтага населенага пункта. У тапанімічным слоўніку прафесар БДУ В. А. Жучкевіч тлумачыць, што ўтварылася яна ад прозвішча Востры, Астрэйка, Астрэнь. У геаграфічным слоўніку каралеўства Польскага гаворыцца, што сваю назву пасёлак бярэ ад назвы ракі, на якой размешчаны — Астрожы, або Астрынкі. Мясцовыя жыхары тлумачаць паходжанне назвы па-іншаму: яно ўтварылася ад слова «востры». Паданне апавяшчае пра тое, што ў гэтых мясцінах у перыяд татара-мангольскага нашэсця быў кравапралітны бой. Назвы населеных пунктаў, якія знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад Астрына, носяць водгалас тых падзей — вёска Галавічполле («поле галоў» — месца масавых пакаранняў смерцю), вёска Шэйбакі (стаянка хана Шэйбака), вёска Касцянёва. Гэтыя падзеі адбываліся ў 1258 годзе. Войска валынскага князя Васількі разам з татарскім атрадам, які ўзначальваў Бурундай, без супраціўлення захапілі землі паўночна-заходняга Панямоння.

У летапісным «Спісе рускіх гарадоў», які складзены, як паказаў М. М. Ціхаміраў, у канцы 14 стагоддзя, сярод заходнерускіх гарадоў названы Астрэе. Даследчыкі паказалі, што ў «Спіс рускіх гарадоў» увайшлі як гарады 14 стагоддзя, так і больш раннія, якія ўжо не існавалі ў момант складання гэтага дакумента, таму, відаць, выкарыстоўваліся пісьмовыя крыніцы папярэдняга часу. М. М. Ціхаміраў лакалізаваў горад Астрэе ў паўночнай частцы Полацкай зямлі, у басейне ракі Лаваці толькі таму, што ў гэтым месцы цяпер знаходзіцца вёска Астрэя. Аднак у гэтым раёне няма старажытнарускага гарадзішча, якое можна было б лічыць рэшткамі старажытнага горада. У сярэдняй паласе Усходняй Еўропы ёсць яшчэ некалькі падобных тапонімаў, у ваколіцах якіх таксама не аказалася якіх-небудзь археалагічных слядоў старажытнарускага горада. Толькі ў адной мясцовасці старажытнарускае гарадзішча спалучаецца з падобным тапонімам. Гэта — Астрына ў Шчучынскім раёне.

Гарадзішча знаходзіцца на паўднёвым усходзе ад Астрына, каля вёскі Кульбачы. Размешчана яно на беразе ракі Астрынкі і належыць да тыпу старажытнарускіх вялікіх гарадоў, умацаванні якіх не залежаць ад рэльефу мясцовасці. На тэрыторыі Панямоння падобныя гарадзішчы будаваліся ўжо ў 10-11 стагоддзях. У плане апісваемае гарадзішча мае няправільна-акруглыя абрысы, яго памеры 70х56 метраў. Яно акальцавана валам, які мае вышыню да 3,5 метраў. З заходняга боку гарадзішча зроблены ўезд. В. В. Сядоў атаясамлівае гэты помнік з ранне-феадальным горадам Астрэе.

З 1989 года экспедыцыя інстытута гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам С. А. Піваварчыка праводзіць археалагічныя даследаванні на гарадзішчы. Актыўны ўдзел у раскопках прымаюць школьнікі Астрынскай сярэдняй школы і студэнты гістарычнага факультэта ГрДзУ. Аб інтэнсіўным жыцці на гарадзішчы сведчыць вялікая колькасць знаходак. Як звычайна на падобных пасяленнях, тут знайдзена вялікая колькасць ганчарнага посуду: збаны, гаршкі, міскі, плошкі. Пераважная колькасць з іх з гарызантальнымі і хвалістымі лініямі арнаменту, насечкамі, уцісканнямі, зігзагамі. Пра занняткі насельніцтва гаспадарчай дзейнасцю гаворыць наяўнасць касцей дзікіх і хатніх жывёл, рыбацкі кручок, гліняныя прасліцы, касцяныя праколкі і качадык для пляцення сетак і кошыкаў, тачыльныя бруські, ручныя жорны. Асаблівую цікавасць уяўляе сабраная калекцыя прадметаў узбраення. Наканечнік кап ′я адносіцца да ранніх тыпаў і ў Беларусі сустрэўся ўпершыню. Блізкі да яго аналаг знайдзены ў паўднёва-усходнім Прыладажжы і датуецца 10 стагоддзем. Такімі ж рэдкімі з ′яўляюцца два ланцэтападобныя з упорам наканечнікі стрэлаў. Падобныя наканечнікі ў Панямонні знайдзены толькі ў Ваўкавыску, а распаўсюджаны яны на паўночна-усходняй Русі ў 10-11 стагоддзях. Жыллё на гарадзішчы было драўляным, пра гэта сведчыць вялікая колькасць глінянай абмазкі са слядамі дрэва і развалы пячэй-каменак. Вал гарадзішча не меў ніякіх унутрывальных канструкцый. Яго ядро складала гліна, а знешні схіл быў умацаваны вялікімі камнямі.

С. А. Піваварчык лічыць, што гарадзішча было заснавана ў 10-11 стагоддзях як ахоўная крэпасць. Такім чынам, можна дапусціць, што храналагічныя рамкі ўзнікнення Астрына адсоўваюцца на 3-4 стагоддзі назад у адносінах да даты яго першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах. У «Кароткай энцыклапедыі БССР» гаворыцца, што Астрына вядома з пачатку 16 стагоддзя як дзяржаўнае уладанне, цэнтр староства Лідскага павета Вялікага княства Літоўскага. А. К. Цітоў канкрэтызуе гэта паведамленне і сцвярджае, што Астрына ўпершыню ўпамінаецца ў 1508 годзе як цэнтр Астрынскага староства, якое ўваходзіла ў Лідскі павет Вялікага княства Літоўскага. Аднак аўтарам гэтага артыкула ўстаноўлена, што 1508 год не з ′яўляецца датай першага ўпамінання. У «Дакументах маскоўскага архіву Міністэрства юстыцыі», у «Запісе зямель дач караля Казіміра» Астрына ўпамінаецца ў 1451 годзе. У ліпені гэтага года ў Астрына быў састаўлены прывілей, па якому кароль Казімір даваў зямлю сваім васалам.

Дзякуючы адкрыццю новых старонак гісторыі гарадскога пасёлка Астрына 1991 год можна з поўным асанаваннем лічыць годам яго 540-годдзя.

**І. ПІВАВАРЧЫК,**
**студэнт 2-га курса гістарычнага факультэта.**

## *ЗАЧАРАВАНЫЯ*



## НОВЫЯ ФІЛЬМЫ

**... Усё пачалося з вялікага пакета з дэфіцытнымі прадуктамі, які з ′явіўся ля дзвярэй сціплага служачага Радзімцава. І пасыпаліся сюрпрызы! Не адразу разумее Клаўдзій Іванавіч, што аказаўся ў цэнтры ўвагі і інтарэсаў мафіі... Аднак перад намі не дэтэктыў, а кінакамедыя пад назвай «ДОПІНГ ДЛЯ АНГЕЛАЎ». У галоўных ролях — Альберт Філозаў, Лія Ахеджакава, Ларыса Удавічэнка і іншыя майстры экрану.**

**«ЧАРОТАВЫ РАЙ» — гэта сэнсацыйная стужка аб адной з калоній рабоў, якія існавалі ў нашай краіне ў часы застою. Некаму з моцных гэтага свету прыйшла ў галаву ідэя: падбухторыць бяздомных і брадзяг, каб бясплатна эксплуатаваць іх працу. У цэнтры фільма — гісторыя адной брыгады «бараноў» (так называюць вязняў лагера, у якім развіваецца асноўнае дзеянне). Аднак ёсць у гэтым лагеры і «пастухі» (ахоўнікі). Галоўнаму герою, маладому хлопцу, прыходзіцца прайсці праз пекла ўсіх выпрабаванняў у калоніі па збіра нню чароту на поўдні нашай краіны. Паставіла карціну на дзіва прафесіянальна маладая жанчына-рэжысёр Алена Цыплакова, вядомая як актрыса («Школьны вальс», «Не баліць галава ў дзятла» і іншыя фільмы на яе рахунку).**

**«ТАК ЖЫЦЬ НЕЛЬГА»— паўнаметражная дакументальна-публіцыстычная стужка рэжысёра Станіслава Гаварухіна, пастаноўшчыка тэлесерыялу «Месца сустрэчы змяніць нельга». На гэты раз Гаварухін шукае прычыны лавіны злачынстваў у нашым грамадстве. Фільм звяртаецца да кожнага з нас. Мы бачым жанчыну, якая свядома замарыла голадам сваіх дзяцей, прысутнічаем на судзе, дзе абвінавачваюцца амаль хлопчыкі, якія згвалцілі і па-зверску забілі сваю аднагодку. Адкуль у людзях гэта жорсткасць! Ці наша гэта краіна! У фільме двойчы гучаць песні У. Высоцкага, празорліўца таго, што адбываецца цяпер.**

**На кінастудыі ім. М. Горкага пастаўлена стужка «КАМУ НА РУСІ ЖЫЦЬ...» Пра што яна!**

**Герой вайны Іван Бачурын, даведаўшыся пра налог на пладовыя дрэвы, загубіў свой асабісты сад, што стала пачаткам многіх няшчасцяў яго жыцця. Стужка псіхалагічна багатая і вельмі актуальная.**

**Шмат у рэпертуары месяца замежных фільмаў, міма якіх не стоіць праходзіць кіналюбу.**

**Герой прыгодніцкай карціны «СЯБАР У НЕПАГОДУ»— афіцыянт рэстарана, на яго напалі злачынцы. Але ён быў смелы, а таму сам вырашыў абдурыць махляроў, якія захацелі пажывіцца за яго кошт.**

**Югаслаўская карціна «ДАВАЙЦЕ ЛЮБІЦЬ»— забаўляльная камедыя аб гастролях вельмі прыгожай эстраднай спявачкі і яе прыгодах.**

**Жахлівае сваёй жорсткасцю забойства царскай сям ′і — усяго толькі падстава для работы над новай кінастужкай. «Мяне цікавіць від людзей,— расказвае К. Шахназараў,— які існаваў заўсёды,— чалавек-кат. У рэвалюцыю прыйшло шмат такіх людзей. Замест узвышанага прынцыпу — памерці дзеля ідэі — яны паставілі іншы — забіць дзеля ідэі. Любой цаной, любой колькасцю ахвяр.**

**У фільме царазабойцам быў Якаў Юроўскі. Яго ролю выконвае англійскі акцёр Малькольм Мак-Дауэл, вядомы па фільмах «О, шчаслівчык!», «Завадны апельсін», «Калігула». На ролю** Мікалая Другога запрошаны Алег Янкоўскі, а на ролю **імператрыцы Аляксандры — Вольга Антонава.**

**НА ЗДЫМКУ: цар Мікалай ДРУГІ ў выкананні Алега Янкоўскага і яго нявеста Аляксандра, ролю якой выконвае Святлана Крынчус.**

**Фота Л. ПАХОМАВАЙ (фотахроніка ТАСС).**




| Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22. пакой 404, тэл. 44-71-97 | Газета выходзіць штотыднёва | Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4. | Зак. 7294 Тыраж 2000 экз. | Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ. |
|---|---|---|---|---|